# Прадмова Івонкі Сурвілы, Старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі

Толькі тая краіна мая,
Што жыць у душы не перастае,
Як свой, без віз адпаведных,
Я ўваходжу ў яе.

Яна бачыць мяне ў бядзе,
У адчаі, у галечы,
Яна мяне спаць кладзе
І духмяным каменем
Мае акрывае плечы.

*Марк Шагал*
*(пераклад Рыгора Барадуліна)*

– На радзіме і дождж сушэйшы...

*Васіль Быкаў*

Кожны чалавек носіць у сэрцы скарб у форме пачуцця прыналежнасці да зямлі, якую яму перадалі продкі, нават калі не заўсёды адчувае, што гэта падмурак яго ідэнтычнасці. Гэты скарб яднае яго з іншымі людзьмі тае зямлі, разам яны ствараюць народ. Аднак беларуская ідэнтычнасць – на маю думку – крыху больш складаная. Яна нешта ў родзе дацкага легендарнага героя Холгер Данске, якога каменная постаць сядзіць у падвалах замка ў Хельсінгёр, ды ў выпадку бяды, устае са свайго трону ды ідзе бараніць свой народ.

2020 год даказаў, што народ наш таксама мае сваю нябачную зброю, наш глыбока засакрэчаны патрыятызм, які і з'яўляецца нашай сілай, нашым беларускім Холгер Данске. На працягу стагоддзяў ён праяўляўся, калі народ

адчуваў пагрозу. Як інакш вытлумачыць наша дзесяцівяковае існаванне, часам у найгоршых умовах? Дзесяць стагоддзяў войнаў і высілкаў ворагаў, каб сцерці нас з паверхні зямлі, не перамаглі нас. Нават пад назовам тутэйшыя, мы ведалі хто мы ёсць.

Народ жыве, яшчэ ўсё жыве, як гэта яскрава даказаў у 2020 годзе. Як той Холгер, наша любоў да Бацькаўшчыны, наша пачуццё прыналежнасці да беларускае зямлі – якую я назвала б галоўнай рысай нашай ідэнтычнасці – аказалася мацнейшай за страх і даказала свету, што мы народ годны і жыццяздольны, і што мы заслугоўваем на волю, якую тыран стараецца ад нас адабраць. З захапленнем свет глядзеў на нашу смеласць і адначасна лагоднасць, на гераізм пад ботам зверскага ўзурпатара.

Але гэты скарб, які мы перахоўваем стагоддзямі не зваліўся з неба. Ён быў нашай зброяй і нашай сілай, калі ў шасцідзясятыя гады дзевятнаццатага стагоддзя наш народ пайшоў за Кастусём Каліноўскім вызваляць наш край ад "маскалёў". Адчулі мы яго асабліва яскрава ў 1918 годзе, калі Рада Беларускай Народнай Рэспублікі абвясціла свету, што народ наш скінуў ярмо царызму, і зноў у 1920 годзе, калі Случчакі пайшлі "ўміраць, каб жыла Бацькаўшчына".

Паводле майго ўласнага доўгага дасведчання на чужыне, найлепш сведчыла да 2020 года пра беларускую ідэнтычнасць наша эміграцыя. Усім Вам вядомыя словы Адама Міцкевіча: "Літва, мая айчына, толькі той ведае колькі Цябе любіць, хто Цябе страціў". Гэта перажываюць яшчэ ўсё шматлікія беларусы замежжа. На чужыне яны адчуваюць тугу па Бацькаўшчыне. Людзі, якія ў Беларусі не размаўлялі па-беларуску, раптоўна адкрываюць у сэрцы бязмежную любоў да свае мовы, да свае зямлі, становяцца беларускімі патрыётамі. Свет без Беларусі траціць для іх свой сэнс, часта ператвараецца ў пустыню. Пачуццё прыналежнасці да сваёй зямлі робіцца штораз мацнейшым, дае ім новыя сілы. Яны ўжо не патрабуюць дапасоўвацца да суседняй ментальнасці. Раптам ганарацца быць беларусамі і выступаюць пад бел-чырвона-белым сцягам у абарону свайго народа. Яны здаюць сабе справу, як іхняя любоў да Бацькаўшчыны дапамагае ім стацца паўнавартаснымі людзьмі. Іх жыццё напаўняецца багацтвам, пра якое яны дасюль і не марылі, стараючыся пад уплывам суседзяў дапасавацца да чужых каштоўнасцей. Не дарэмна акупанты робяць велізарныя высілкі, каб выкараніць у нас нашу ідэнтычнасць ды замяніць яе сваёю.

Дзякаваць Богу, беларуская ідэнтычнасць за глыбокая, каб хтось мог яе выкараніць. Яна заўсёды застанецца той унутранай сілай, якая нас будзе берагчы да канчатковай перамогі ў змаганні за свабоду і незалежнасць.

# Przedmowa Iwonki Surwiły, Przewodniczącej Rady Białoruskiej Republiki Ludowej

Tylko ten kraj jest mój,
Który nie przestaje żyć w duszy,
Do którego bezwizowo
Ja wchodzę.

On widzi mnie w biedzie,
W rozpaczy, w ubóstwie,
On usypia mnie
I pachnącym kamieniem
Moje ramiona otula.

*Marc Chagall*

– W domu nawet deszcz jest bardziej suchy...

*Wasil Bykau*

Każdy nosi w sercu skarb w postaci poczucia przynależności do ziemi danej mu przez przodków, nawet jeśli nie zawsze czuje, że to jest jego tożsamość. Ten skarb łączy go z innymi mieszkańcami tej ziemi, z którymi tworzy naród. Jednak tożsamość białoruska jest – moim zdaniem – trochę bardziej złożona. To tak jak Ogier Duńczyk (legendarny bohater narodowy Danii, po duńsku Holger Danske) – siedzi w podziemiach zamku w Helsingorze, ale w razie kłopotów wstaje z tronu i idzie bronić swego ludu.

Rok 2020 dowiódł, że nasz naród też ma swoją niewidzialną broń, nasz głęboko skryty patriotyzm, który jest naszą siłą, naszym białoruskim Ogierem Duńczykiem. Od wieków ta siła objawiała się wtedy, gdy ludzie czuli się zagrożeni. Jak inaczej wytłumaczyć naszą tysiącletnią egzystencję, czasami w najgorszych warunkach? Dziesięć wieków wojen i wysiłków wrogów, aby zmieść nas z powierzchni ziemi, nie pokonało nas. Nawet wtedy, gdy nazywano nas „tutejszymi", wiedzieliśmy, kim jesteśmy.

Naród wciąż żyje, co zostało wyraźnie udowodnione w 2020 roku. Tak jak we wspomnianej legendzie o Holgerze Danske – nasza miłość do Ojczyzny, nasze poczucie przynależności do ziemi białoruskiej, którą nazwałabym główną cechą naszej tożsamości, okazały się silniejsze od strachu i pokazały światu, że jesteśmy narodem godnym, który zasługuje na wolność, chociaż tyran próbuje ją nam odebrać. Świat z podziwem patrzył na naszą odwagę i zarazem dobroć, na bohaterstwo pod butem brutalnego uzurpatora.

Ten skarb, który ukrywaliśmy od wieków, nie spadł jednak z nieba. Był naszą bronią i naszą siłą w latach sześćdziesiątych XIX wieku, kiedy nasz naród poszedł za Konstantym Kalinowskim, aby wyzwolić nasz kraj od „Moskali". Szczególnie dotkliwie odczuliśmy to w 1918 roku, kiedy Rada Białoruskiej Republiki Ludowej ogłosiła światu, że nasz naród zrzucił jarzmo caratu i ponownie w 1920 roku, kiedy powstańcy słuccy poszli „umrzeć, aby Ojczyzna mogła żyć".

Z moich wieloletnich obserwacji wynika, że nasza diaspora była najlepszym dowodem trwałości tożsamości białoruskiej do 2020 roku. Wszyscy znają słowa Adama Mickiewicza: „Litwo, Ojczyzno moja! ty jesteś jak zdrowie; ile cię trzeba cenić, ten tylko się dowie, kto cię stracił". Wciąż tego uczucia doświadcza wielu Białorusinów za granicą. Na obczyźnie tęsknią za domem. Ludzie, którzy nie mówili po białorusku na Białorusi, nagle zaczęli otwierać swoje serca na bezgraniczną miłość do swojego języka, do swojej ziemi, i zostali patriotami. Świat bez Białorusi stracił dla nich sens, często zamieniając się w pustkę. Poczucie przynależności do swojej ziemi staje się coraz silniejsze, daje im nową siłę. Nie potrzebują już dostosowania się do mentalności sąsiadów. Nagle stają się dumni z tego, że są Białorusinami i stają pod biało-czerwono-białą flagą w obronie swojego narodu. Oni zdają sobie sprawę z tego, jak miłość do Ojczyzny pomaga im stać się pełnoprawnymi ludźmi. Ich życie wypełnia się bogactwem, o którym jeszcze nie marzyli, próbując pod wpływem sąsiadów dostosować się do wartości innych ludzi. Nic dziwnego, że okupanci dokładali wszelkich starań, aby wykorzenić naszą tożsamość i zastąpić ją ich własną.

Dzięki Bogu tożsamość białoruska jest tak głęboka, że nikt nie może jej wykorzenić. Zawsze pozostanie wewnętrzną siłą, która będzie nas chronić, aż do ostatecznego zwycięstwa w walce o wolność i niepodległość.

# Прадмова Пётры Мурзёнка, Старшыні Беларускага інстытуту навукі і мастацтва ў Канадзе

Праблемы нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў былі і ёсць актуальнымі. Яны і будуць актуальнымі да той пары, пакуль можна будзе сказаць: так, беларуская нацыя ўсталявалася, усталявалася ў вольнай дзяржаве, незалежнай ад еўразійскай цывілізацыі, пазбавіўшыся дыктатуры і знайшоўшы свой правільны шлях у сусвеце.

Пытанне нацыянальнай ідэнтыфікацыі – ключавое для рэалізацыі нацыянальнай ідэі, канчатковым прадуктам якой і ёсць нацыянальная дзяржава. Пасля некалькіх істотных параз, звязаных з будаўніцтвам нацыянальнай дзяржавы ў XX стагоддзі, беларускае грамадства ўсё яшчэ мае запыт на кансалідацыю, і, хачу падкрэсліць, не кароткачасовую, а доўгатэрміновую стратэгічную кансалідацыю розных яго слаёў, уключаючы навуковую супольнасць. Бо кансалідацыя палітычная ў стаўленні да будаўніцтва нацыі ў значнай ступені не была рэалізавана як мінулай, так і сучаснай нацыянальна-свядомай элітай і ў асноўным па прычыне палітычнай блізарукасці, адсутнасці як адзінства, так і выпрацаванай стратэгіі, а не толькі па прычыне рэпрэсіўнага ўплыву дыктатарскага рэжыму.

Калі праводзіць гістарычныя паралелі, то ў параўнанні з нашымі самымі блізкімі суседзямі, Беларусь адстае ў сваім нацыянальным развіцці. Гэта яскрава заўважна, калі зазірнуць на пачатак і на канец мінулага стагоддзя. Так, высілкі Іосіфа Пілсудскага, польскай эліты, а таксама Літоўскай Тарыбы скончыліся станаўленнем Польскай і Літоўскай дзяржаў; актыўнасць нацыянальных эліт вывела гэтыя краіны за межы ўплыву СССР–Расіі і далучыла іх у ЕС і НАТО. Ні таго, ні другога нацыянальна-свядомыя сілы ў Беларусі не асягнулі – не маем асноўнага – па-сапраўднаму незалежнай нацыянальнай дзяржавы. Прычын таму шмат. Асабліва гэта заўважна сёння – падчас Рэвалюцыі надзеі, як я яе называю. Адной з такіх прычын

з'яўляецца тое, што беларусам пастаянна не стае волі і кансалідуючага цэнтра, які б мог стратэгічна вызначыць шлях, па якім Беларусь магла б вызваліцца з-пад імперскіх аковаў суседа і з-пад савецкага мінулага, якім кіруецца дыктатар Лукашэнка.

Праграма канферэнцыі прадугледжвае разгляд пытанняў ідэнтыфікацыі беларусаў у тых ці іншых краінах як сёння, так і ў мінулым. Відавочна, што праблема самаідэнтыфікацыі беларускіх эмігрантаў, улічваючы асіміляцыю з насельніцтвам краіны пражывання і іх канчатковае рашэнне эміграваць па той ці іншай прычыне, значна больш складанае, чым тая ж праблема на радзіме. Было б таксама цікава параўнаць і ацаніць магчымы ўплыў дыяспары і саміх працэсаў ідэнтыфікацыі на сітуацыю ў Беларусі – **да** Рэвалюцыі надзеі, і **цяпер**, калі яна распачалася і працягваецца.

Было б цудоўна, калі б у выніку кансалідаванай навуковай думкі на сённяшняй канферэнцыі можна было атрымаць такія рэцэпты, якія б дапамаглі беларусам, 84,9% якіх вызначаюць сябе беларусамі на радзіме, прыйсці да разумення сапраўднай, глыбіннай, існай нацыянальнай ідэнтыфікацыі, вырвацца з імперыі зла і выплысці ў добрым нацыянальным здароўі на бераг дэмакратыі, жыцця і гуманізму. Амаль 70 гадоў таму Чэслаў Мілаш пісаў пра характар дзеяў нацыянальных сіл ва ўмовах дыктатуры. З таго часу ў яго краіне і ў нашых суседзяў шмат чаго змянілася ў пазітыўным кірунку. На шляху да прагрэсу знаходзіцца Украіна, якую я кваліфікую як нашага суседа па заходнерутэнскай цывілізацыі. Веру, што надзея на свой шлях застаецца і для Беларусі.

*Атава, 1 красавіка 2021 года*

# Przedmowa Piotry Murzionaka, Prezesa Białoruskiego Instytutu Nauki i Sztuki w Kanadzie

Problem tożsamości narodowej Białorusinów był i nadal jest aktualny. Nie straci on na aktualności, dopóki naród białoruski nie uwolni się od cywilizacji eurazjatyckiej, pozbywając się dyktatury i odnajdując właściwą drogę w świecie.

Kwestia identyfikacji narodowej jest kluczem do realizacji idei narodowej, której ostatecznym wynikiem jest państwo narodowe. Po kilku znaczących porażkach w budowaniu narodu w XX wieku społeczeństwo białoruskie wciąż potrzebuje konsolidacji. Chcę podkreślić, że nie chodzi tu o zjednoczenie krótkoterminowe, lecz o długofalową strategiczną konsolidację różnych warstw, w tym naukowców. Konsolidacja polityczna w odniesieniu do budowania narodu w dużej mierze nie została zrealizowana zarówno przez dawne, jak i obecne elity białoruskie – i to głównie z powodu politycznej krótkowzroczności, braku jedności i strategii, a nie tylko z powodu represji dyktatury.

Jeśli poszukamy analogii w historii, to zrozumiemy, że w porównaniu z najbliższymi sąsiadami Białoruś pozostaje w tyle rozwoju narodowego. Widać to wyraźnie na podstawie wydarzeń na początku i końcu ubiegłego wieku. Starania Józefa Piłsudskiego i elit polskich oraz litewskiej Taryby zakończyły się utworzeniem państw polskiego i litewskiego. Działalność elit narodowych wyprowadziła te państwa poza wpływy ZSRR i Rosji oraz włączyła je do UE i NATO. Tymczasem na Białorusi żadne uświadomione narodowo elity nie zdołały zbudować prawdziwie niezależnego państwa narodowego. Jest to szczególnie widoczne dzisiaj – w czasie Rewolucji Nadziei, jak ją nazywam. Powodów jest wiele – jednym z nich jest to, że Białorusinom ciągle brakuje woli i konsolidacyjnego centrum, aby strategicznie określić sposób, w jaki Białoruś mogłaby uwolnić się z imperialnych kajdan sąsiada i sowieckiej przeszłości promowanej przez dyktatora Łukaszenkę.

Jest oczywiste, że problem samoidentyfikacji białoruskich emigrantów, biorąc pod uwagę asymilację z ludnością ich kraju zamieszkania i powód ich

ostatecznej decyzji o emigracji, jest znacznie bardziej skomplikowany niż ten sam problem w kraju. Dlatego interesujące byłoby porównanie i ocena możliwego wpływu diaspory i procesów identyfikacyjnych na sytuację na Białorusi zarówno przed Rewolucją Nadziei, jak i teraz, gdy ona trwa.

Byłoby wspaniale, gdyby w wyniku ugruntowanej myśli naukowej udało się znaleźć dla Białorusinów sposób, który umożliwiłby im zrozumienie, czym jest prawdziwa i głęboka tożsamość narodowa (84,9% obywateli Białorusi deklaruje narodowość białoruską) i pomógł im wyrwać się z imperialnych szponów, aby popłynąć w dobrym zdrowiu narodowym do brzegów demokracji, życia i humanizmu. Niemal 70 lat temu Czesław Miłosz pisał o charakterze działań sił narodowych pod dyktaturą. Od tego czasu wiele zmieniło się na korzyść w jego kraju i u naszych sąsiadów. Na drodze do postępu znajduje się Ukraina, którą uważam za naszego sąsiada z kręgu cywilizacji zachodnioruskiej. Wierzę, że jest nadzieja, iż Białoruś także znajdzie własną drogę.

# Прадмова Захара Шыбекі, Прафесара Тэль-Авіўскага ўніверсітэта

Празмерна рад, што маю магчымасць вітаць вас з Ізраіля. Грамадзяне гэтай краіны, выхадцы з Беларусі, адзінадушна прынялі сцяг і герб БНР. Яны вельмі актыўна падтрымліваюць перамены на сваёй радзіме. У вывучэнні эвалюцыі самаідэнтыфікацыі беларусаў, безумоўна, павінна ўлічвацца яўрэйская прысутнасць. Супольнасць беларускіх яўрэяў у Ізраілі – гэта важны рэсурс для рамонту разбуранага беларускага дома. Вядома, што дзеячы БНР пастаянна імкнуліся ангажаваць яўрэяў у беларускія справы.

Пытанне нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў займае вельмі важкае месца ў даследаваннях над гісторыяй беларускага народа. Гісторыкі ў стане не толькі вывучаць эвалюцыю самаідэнтыфікацыі жыхароў Беларусі, але і практычна ўмацаваць іх знітаванне. Па-першае, гісторыкам пад сілу разбурыць беларускі сіндром непазбежнай залежнасці ад Расіі, каб зрабіць беларусаў вольнымі грамадзянамі. Гісторыя беларуска-расійскіх адносін сведчыць, што беларусы лёгка купляліся на салодкія абяцанкі Расіі, але потым наступала горкае расчараванне і падман. Па-другое, гісторыкі ўжо падрыхтаваны для стварэння праўдзівых калектыўных прац агульнанацыянальнага маштабу, прызначаных для ўсёй беларускай нацыі. І не толькі. Еўрапейская грамадскасць, заінтрыгаваная падзеямі ў сучаснай Беларусі, ужо падрыхтаваная да зацікаўленага азнаямлення з яе гісторыяй. Застаецца толькі перакласці нашу гісторыю на мовы еўрапейскіх народаў, каб яны больш глыбока і рэальна зразумелі заканамерную тэндэнцыю вяртання беларусаў у еўрапейскую супольнасць. Таму я вітаю ідэю выдання калектыўнай працы *Беларуская ідэнтычнасць: досвед мінулага і выклікі сучаснасці*, якая з’яўляецца плёнам працы даследчыкаў: айчынных і замежных беларусістаў.

Выданне гэтай калектыўнай манаграфіі з’яўляецца вельмі своечасовым, калі пытанне беларускай ідэнтычнасці ўваходзіць у наступную фазу свайго развіцця і набывае новае вымярэнне. На пераломе эпох у Беларусі жыць балюча, але цікава. Бясспрэчна, што нас, гісторыкаў, чакаюць вялікія справы. Вось я і хачу пажадаць нам усім поспехаў!

# Przedmowa Zachara Szybieki, Profesora Uniwersytetu w Tel-Awiwie

Bardzo się cieszę, że mam okazję powitać Państwa z Izraela. Obywatele tego kraju pochodzący z Białorusi jednogłośnie przyjęli flagę i godło Białoruskiej Republiki Ludowej (BRL). Ci ludzie bardzo aktywnie wspierają przemiany w swojej ojczyźnie. Badania ewolucji samoidentyfikacji Białorusinów muszą również uwzględniać rolę Żydów w dziejach Białorusi. Białoruska społeczność żydowska w Izraelu jest ważnym elementem mogącym wspierać naprawę zniszczonego domu białoruskiego. Jeszcze w czasach BRL społeczność żydowska czynnie uczestniczyła w życiu białoruskim.

Kwestia tożsamości narodowej Białorusinów zajmuje bardzo ważne miejsce w badaniach nad historią narodu białoruskiego. Historycy są w stanie nie tylko badać ewolucję samoidentyfikacji narodu białoruskiego, lecz także ją wzmacniać. Po pierwsze, historycy mogą pomóc społeczeństwu białoruskiemu uwolnić się od syndromu zależności od Rosji i tym samym uczynić Białorusinów wolnymi obywatelami. Historia stosunków białorusko-rosyjskich dowodzi, że Białorusini dawali się uwieść słodkim obietnicom Rosji, lecz potem następowało gorzkie rozczarowanie i zawód. Po drugie, historycy już są przygotowani do tworzenia publikacji, których odbiorcą jest naród białoruski i nie tylko. Współczesne wydarzenia na Białorusi wzbudziły zainteresowanie Europejczyków, którzy też już są gotowi zgłębiać wiedzę na temat historii Białorusi. Musimy tylko przetłumaczyć naszą historię na języki narodów europejskich, żeby one głębiej zrozumiały wszelkie zawiłości związane z powrotem Białorusinów do rodziny europejskiej. W związku z tym z satysfakcją przyjmuję pomysł wydania monografii zbiorowej *Tożsamość białoruska: doświadczenia przeszłości i wyzwania teraźniejszości*, która jest efektem pracy badaczy zarówno krajowych, jak i zagranicznych.

Publikacja tej zbiorowej monografii następuje we właściwym momencie, gdy kwestia tożsamości białoruskiej wchodzi w kolejną fazę swojego rozwoju i nabiera nowego wymiaru. Życie na Białorusi na przełomie wieków jest bolesne, ale też interesujące. Nie ulega wątpliwości, że na nas, historyków, czekają wielkie wyzwania. Życzę zatem nam wszystkim sukcesów!